*Краскоўская Н. Н.*

# У ГАДЫ ВЫПРАБАВАННЯЎ

*ЦРА № 65 Карэлічскага раёна Гродненскага РУП «Фармацыя», г. п. Карэлічы*

У час вялікай Айчыннай вайны Радзіму ад ворагу абаранялі не толькі байцы-мужчыны, але і адважныя жанчыны, якія ў першыя дні вайны добраахвотна пайшлі на фронт. Усяго ў ваенных дзеяннях на фронце прымалі ўдзел звыш 800 тысяч жанчын: снайперы, зенітчыцы, радысткі, лётчыцы, разведчыцы і медыкі — урачы, медсёстры, санітаркі. Яны выцягвалі параненых з поля боя, аперыравалі іх у шпіталях, даглядалі пасля раненняў і аперацый, забяспечвалі хворых медыкаментамі.

Сярод тых, хто ратаваў жыццё параненых у час вайны была і фармацэўт Карэліцкай раённай аптэкі Малахоўская Аляксандра Іларыёнаўна, якой, на жаль, ужо няма ў жывых. У архіве аптэкі захавалася асабістая справа ўдзельніцы Вялікай Айчыннай вайны. Сярод дакументаў — аўтабіяграфія Аляксандры Іларыёнаўны, радкі якой сведчаць, што нарадзілася яна 1 ліпеня 1922 г. ў вёсцы Паўлаўшчына Віцебскага раёна ў сялянскай сям'і. Закончыўшы сямігодку,

дзяўчына вырашыла прысвяціць сваё жыццё аптэчнай справе. З пасведчання даведаемся, што Аляксандра вучылася ў Віцебскай дзяржўнай фармацэўтычнай школе з 1 верасня 1938 г. па 8 ліпеня 1941 г. Яна паспяхова закончыла навучальную ўстанову і атрымала спецыяльнасць памочніка правізара. Праўда, выпускныя экзамены навучэнка фармацэўтычнай школы здавала ўжо ў той час, калі пачалася вайна.

У вольны час выпускніцы фармацэўтычнай школы праходзілі курсы медыцынскіх сясцёр, рыхтаваліся на фронт.

Фашысты занялі Оршу, наступалі на Віцебск. Нарэшце студэнты здалі апошні экзамен, а назаўтра 15 чалавек прыйшлі ў ваенкамат. Сярод іх была Аляксандра Іларыёнаўна Малахоўская. Іх адправілі ў мястэчка Лёзна, якое раскінулася па Смаленскай шашы. Тут усіх размеркавалі па вайсковых часцях. Аляксандра Іларыёнаўна трапіла медсястрой у палявы шпіталь, які абслугоўваў танкавыя часці 3-га Беларускага фронту.

Першае баявое хрышчэнне яна атрымала пры абароне Лёзна. Амаль не спыняліся бамбёжкі. І дзяўчына ішла пад агнём да параненых. Як магла, сунімала боль, суцяшала іх.

Аднойчы рыхтавалі да адпраўкі эшалон з параненымі, як раптам наляцелі самалёты са свастыкай. Пачалася бамбёжка. А прытомленая Аляксандра ў шпіталі. Хацела зірнуць, дзе яна, а ў вачах цёмна. Хацела пaварушыць рукамі — і не змагла, раненне аказалася цяжкім, да таго ж дзяўчына атрымала моцныя апёкі.

Толькі ў сакавіку 1942 г. зноў стала Аляксандра ў адзіны строй з салдатамі. Засталася ў гэтым жа шпіталі, што ў Старых Дарогах, фармацэўтам.

Цяжка ў франтавых ўмовах рыхтаваць лякарства. Бывае, з вопытам чалавек у нармальных абставінах і то памыляецца, а ёй не было ў каго спытаць парады. Але яна старалася быць уважлівай, бо ведала, што яе памылка можа некаму каштаваць здароўя. Здараліся дні, калі з-за агню і дыму не было відаць неба. А шпіталь трапіў пад абстрэлы. Трэба мець вялікую мужнасць, сілу волі, каб не разгубіцца, бачачы, як ляцяць бомбы на бездапаможных параненых людзей, і ратаваць іх.

Аднаго разу ў Кенігсбергу ў шпіталь паступіў цяжка паранены генерал. Толькі пераліванне крыві магло дапамагчы. Лабараторыі, каб вызначыць дакладную групу крыві, не было, таму карысталіся паслугамі тых, у каго яна вядома. Аляксандра яшчэ да вайны была донарам, ведала, што ў яе кроў першай групы, і прапанавала: «Вазьміце маю». Генерал паправіўся.

У Кенігсбергу шпіталь сустрэў Перамогу. Было ціха-ціха. І раптам арудыйныя залпы разарвалі цішыню. Неба асвяцілася ракетамі. Радасць, смех, шчасце ліліся цераз край.

Аднак для Аляксандры Іларыёнаўны вайна на гэтым не закончылася. Увесь шпіталь у ліпені накіравалі на Далёкі Усход. Там тлеўся ачаг вайны.

Зімой 1946 г. лейтэнант медыцынскай службы Аляксандра Іларыёнаўна Малахоўская была дэмабілізавана.

Вярнулася ў родную Беларусь. Знайшла маці і брата ў Івянцы. Там яе прызначылі загадчыцай аптэкі, потым перавялі ўпраўляючай у Мір.

Репозиторий БГМУ

Пра далейшы лес Аляксандры Іларыёнаўны расказалі яе былыя калегі і дачка Святлана. З 16 лістапада 1965 г. ўдзельніца вайны працавала фармацэўтам у аптэцы № 65 Карэліцкага раёна. Работнікі аптэкі памятаюць яе як добрасумленнага работніка і ўважлівага, спакойнага, добразычлівага чалавека. Лепшыя якасці характару Аляксандра Іларыёнаўна захавала, нягледзячы на цяжкія выпрабаванні вайной, за ўдзел у якой была ўзнагароджана медалямі «За баявыя заслугі», «За адвагу», «За ўзяцце Кенігсберга», «За перамогу над Японіяй» і іншыя. Разам з мужам Аркадзіем Аляксандравічам жанчына выгадавала траіх дзяцей. Бацькі далі ім добрую адукацыю.

Аляксандра Іларыёнаўна працягвала працаваць ў Карэліцкай цэнтральнай раённай аптэцы і тады, калі была ўжо на пенсіі. 16 кастрычніка 2000 г. яе не стала. Фотаздымкі і дакументы ўдзельніцы вайны захоўваюцца ў Карэліцкім раённым краязнаўчым музеі.

Гаворачы пра падзеі Вялікай Айчынный вайны, нельга не ўспомніць трагічны лёс работнікаў Карэліцкай аптэкі, якія сталі ахвярамі Халакосту. У Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці захоўваюцца дакументы, адзін з якіх датуецца 1941 г. Гэта спіс работнікаў аптэкі ў Карэлічах. Дакумент сведчыць, што 24 кастрычніка 1941 г. загадчыкам аптэкі быў Шмярковіч Якаў Хаімавіч, яўрэй, 1893 года нараджэння. Дыплом магістра фармацыі ён атрымаў у Львове.

Пасаду рэцэптара з 1929 г. займала Намёт Рэвека Гесэлеўна, яўрэйка, 1896 года нараджэння.

Бухгалтарам 19 ліпеня 1941 г. быў прызначаны Тамасік Іван Мікалаевіч.

Вядома, што ў час вайны фашысты стварылі ў Карэлічах гета. Каля тысячы яўрэяў яны перасялілі ў спецыяльны адведзяны раён, дзе людзі ўтрымліваліся да лета 1942 г. Калі пачалася расправа, яўрэяў пачалі выганяць з хатаў, здзекуючыся над нямоглымі і дзецьмі. Затым іх пехатою гналі ў Навагрудак, дзе і растралялі. Частку людзей, якія не маглі ісці, падаючы ад слабасці, фашысты забілі па дарозе. У спісе насельніцтва гета ў Карэлічах, які захоўваецца ў Карэліцкім раённым музеі, знаходзяцца прозвішчы работнікаў аптэкі Якава Шмярковіча і Рэвекі Намёт, якія раздзялілі лёс многіх іншых яўрэяў, загінуўшых у час вайны.

Былая жыхарка мястэчка Мір Сара Ландэр, якая нарадзілася ў сям’і мірскіх яўрэяў, успаміналa, што яе бацька, Хаймовіч Бенцыян Шлемавіч, перед вайной быў накіраваны ў Беласток на курсы правізараў, а затым загінуў падчас бамбёжкі. Сару і яе маці, у верасні 1942 г., ад растрэлу схавалі знаёмыя. Затым яны разам з тымі яўрэямі, якіх фашысты не знішчылі адразу, пасяліліся ў гета, якое вясной 1942 г. было перамешчана ў Мірскі замак, дзе людзі жылі ў жудасных умовах. Маці Сары мела пропуск і працягвала працаваць у аптэцы. Яе выратавала толькі тое, што яна была добрым спецыялістам, а немцы вельмі баяліся эпідэмій.

Ганна Савельеўна Хаймовіч употай дапамагала партызанам, перадавала ім патрэбныя лекі. У кастрычніку 1943 г. адна з жыхарак Міра папярэдзіла работніцу аптэкі, што немцы збіраюцца яе растраляць. Жанчыну разам з дачкой схавалі знаёмыя, я затым яны ўцяклі ў лес і трапілі ў партызанскі атрад «Камсамольскі», дзе былая работніца дапамагала своімі медыцынскімі ведамі партызанам, чым магла.

Репозиторий БГМУ